Гісторыя

УДК 321911

*А.П.Жытко, В.М.Фамін*

# Адукацыйны ўзровень дваранства Беларусі ў 1861-1914 гг.

Развіццё капіталізму ў парэформенныя гады з'яўлялася адным з каталізатараў фарміравання самасвядомасці беларускага народа, беларускай нацыі. Падмуркам гэтага аб'ектыўнага працэсу было пашырэнне пісьменнасці сярод усіх пластоў грамадства, а таксама фарміраванне беларускай інтэлігенцыі. У сувязі з гэтым важнае значэнне мае пытанне аб крыніцах папаўнення інтэлектуальнай эліты, яе саслоўным паходжанні. Аднак у беларускай гістарыяграфіі гэта няпростая праблема мала даследавана.

Адзінай статыстычнай крыніцай для высвятлення гэтага пытання служыць Першы ўсеагульны перапіс насельніцтва, які праводзіўся ў 1897 г. Аналізуючы яго даныя можна сцвярджаць, што самай высокаадукаванай часткай беларускага грамадства на прыканцы XIX ст. было вышэйшае дваранскае саслоўе. Выключэнне складалі толькі святары, сярод якіх паказчык пісьменнасці быў некалькі вышэйшым, чым у дваран. Аднак апошнія апярэджвалі культавых служыцеляў па колькасці чалавек, меўшых вышэйшую адукацыю [1].

Большасць шляхетнага саслоўя пражывала ў сельскай мясцовасці. Чыноўнікі не з дваран і асабовыя дваране ў асноўным групаваліся ў гарадах, таму разгледзім адукацыйны ўзровень гэтай катэгорыі насельніцтва раздзельна: у паветах без гарадоў і ў гарадах.

У 1897 г. у 35 паветах без гарадоў патомных, асабовых дваран і чыноўнікаў не з дваран мужчынскага полу налічвалася 64895 чалавек, сярод якіх пісьменных было 36180 (55,8%); жанчын 67148 чал., пісьменнасць сярод якіх была менш значнай (42,5%). Згодна даных, амаль палова гэтай групы была непісьменнай. Аднак на справе гэта не так, таму што ў графы "пісьменны" і "непісьменны" ўключаны і дзеці да 10 гадоў. Больш правільна выключыць гэту ўзроставую групу з падлікаў, таму што дзеці да 10 гадоў у той час рэдка наведвалі школу. У выніку атрымаецца, што працэнт непісьменных сярод мужчын знізіўся да 29,9, а жанчын — да 45,8 [1; табл. 2].

Абсалютныя паказчыкі не даюць магчымасці высветліць узровень пісьменнасці ў разрэзе губерняў, таму што колькасць чалавек аналізуемай групы была рознай. У сувязі з гэтым неабходна выкарыстаць адносныя паказчыкі. Найбольшая колькасць пісьменных наглядалася ў 6 паветах Гродзенскай губерні : сярод мужчын — 74,6%, жанчын — 71,2%. Найменш пісьменных мужчын (49,8%) было ў 5 паветах Віцебскай губерні, а жанчын (31/6%) — у Мінскай [1].

У гарадах Беларусі працэнт пісьменных быў значна большым, чым у правінцыі. Так, у беларускіх гарадах 5 губерняў сярод мужчын ён склаў 81,2%, а жанчын 76,8%. Калі выключыць непісьменных дзяцей да 10 гадоў, то на 100 чал. прыходзіцца 94,3% пісьменных мужчын і 87,5% жанчын [табл. 2].

Па ўзроўні пісьменнасці на першым месцы аказаліся гарады Гродзенскай губерні (85,1% мужчыны і 82,7% жанчыны разам з дзецьмі да 10 гадоў), а на апошнім (74,7% мужчыны і 68,5% жанчыны) — 4 паветы Віленскай, таму што губернскі горад Вільна, дзе была сканцэнтравана найбольшая колькасць пісьменных і высокаадукаваных дваран і чыноўнікаў, не ўваходзіў у 4 беларускія паветы гэтай губерні [1].

У параўнанні з усім насельніцтвам края пісьменнасць дваран і класных чыноўнікаў яшчэ больш уражвае. Так, калі у 35 паветах без гарадоў было 55,8% пісьменных мужчын дваран і чыноўнікаў, а жанчын — 42,5%, то сярод усяго насельніцтва налічвалася толькі 25,1% пісьменных мужчын і 9,1% жанчын. У гарадах на 1000 дваран і чыноўнікаў мужчынскага полу прыходзілася 812 пісьменных мужчын і 768 жанчын, а на 1000 жыхароў адпаведна прыпадала 548 мужчын і 350 жанчын [табл. 1, 2]. Паказчыкі сведчаць,што розніца ва ўзроўні пісьменнасці сярод мужчын і жанчын вышэйшага саслоўя і класных чыноўнікаў зусім нязначная. Гэта сведчанне высокай ступені эмансіпіраванасці дваранак, чаго нельга сказаць аб прадстаўніцах другіх саслоўяў і класаў.

Разам з тым адносна высокі працэнт непісьменных дваран тлумачыцца сканцэнтраванасцю на Беларусі значнай часткі былой беззямельнай і малазямельнай шляхты, якая вяла сялянскі вобраз жыцця і не мела сродкаў і часу для атрымання пачатковай школьнай адукацыі.

У асяроддзі дваран і чыноўнікаў быў больш высокі працэнт асоб, якія вучыліся ў сярэдніх, сярэдніх спецыяльных і вышэйшых навучальных установах. Так, у паветах без гарадоў такую адукацыю мелі 8,8% мужчын і 3,7% жанчын, у гарадах адпаведна 49,1% і 24,2%, а ўсяго ў гарадах і ў паветах 18,4% мужчын і 8,7% жанчын [табл. 2]. На час перапісу ў 35 паветах вучыліся ва універсітэтах 2466, вышэйшых спецыяльных і тэхнічных навучальных установах 616, сярэдніх спецыяльных — 1282, у гімназіях і рэальных вучылішчах 15781, у вышэйшых і сярэдніх ваенных навучальных установах 3324 дваран і чыноўнікаў. Усяго ў гэтых установах навучалася 23469 чал., што складала 23,9% ад усіх пісьменных [1]. Дваране і чыноўнікі, атрымаўшыя вышэйшую і сярэднюю адукацыю, пераважна жылі ў гарадах (65,2%), дзе маглі заняць адпаведныя пасады ў сістэме органаў кіравання, навучальных установах і г.д. [1].

Калі параўнаць колькасць дваран і чыноўнікаў, закончыўшых вышэйшыя і сярэднія навучальныя ўстановы, па ўзроставых групах, то сярод іх пераважалі 30-39-гадовыя, альбо тыя, хто вучыўся ў 60-70-х гадах, што прыпадала на час рэформ Аляксандра II і дэмакратызацыі студэнцкага жыцця. У гэтыя гады універсітэты

закончылі 760 (32,1%) мужчын і 43 (43,9%) жанчыны, спецыяльныя і тэхнічныя вышэйшыя навучальныя ўстановы — адпаведна 200 (33,4%) і 8 (44,4%), спецыяльныя сярэднія — 360 (30,6%) мужчын і 39 (36,4%) жанчын. Акрамя гэтага, 37 (26,8%) мужчын атрымалі вышэйшую і 860 (27,0%) сярэднюю ваенную адукацыю [1].

Больш яскрава адукаванасць дваран і класных чыноўнікаў праяўляецца ў параўнанні з усім насельніцтвам. Так, на долю гэтых катэгорый прыходзілася 81,0% мужчын і 64,9% жанчын, якія мелі універсітэцкую адукацыю, адпаведна 83,5 і 90,0%, закончыўшых іншыя вышэйшыя навучальныя ўстановы. Апроч таго, дваране аддавалі перавагу вышэйшым і сярэднім ваенным навучальным установам. Прадстаўніцтва ў іх іншых саслоўяў было нязначным. На долю дваран прыходзілася 96,5% з атрымаўшых вышэйшую ваенную і 94,3% — сярэднюю ваенную адукацыю. Найменш цікавілі дваран сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы. Закончыўшыя іх мужчыны склалі 27,4%, а жанчыны — 22,2%. Такія ўстановы давалі спецыяльныя веды ў галіне камерцыйнай, прамысловай і сельскагаспадарчай дзейнасці, у якіх былі больш зацікаўлены непрывілеяваныя саслоўі. У сярэдніх навучальных установах дваране складалі каля паловы вучыўшыхся. Сярод жанын пераважалі дваранкі (56,1%) [табл. 1, 2].

Дыскрымінацыйная палітыка, якую праводзіў царызм у адносінах да дваран-католікаў, уплывала на колькасць высокаадукаваных прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя. Пасля падаўлення паўстання 1863 г. католікі практычна не мелі магчымасці атрымаць вышэйшую адукацыю за мяжой. Для іх уводзіліся абмежаванні і пры паступленні ў расійскія навучальныя ўстановы. З канца 50-х гадоў па рашэнні Камітэта міністраў для католікаў уводзіўся 10-працэнтны бар`ер пры паступленні ў ВНУ [2]. Адзіная на беларусі ўстанова — Горы-Горыцкі земляробны інстытут, якая давала вышэйшую адукацыю, была зачынена.

Нягледзячы на гэта, дваранства ў беларускім краі на рубяжы XIX-XX ст. заставалася самым адукаваным саслоўем. Выхадцамі з яго асяроддзя былі амаль усе спецыялісты з універсітэцкай і іншай вышэйшай адукацыяй, армейскія афіцэры, а таксама не менш паловы спецыялістаў з сярэдняй адукацыяй. Сказанае азначае, што, як і ў цэлым па Расіі, інтэлігенцыя края фарміравалася пераважна са складу вышэйшага саслоўя і чыноўнікаў. Аднак рэгіянальнай асаблівасцю Беларусі з`яўлялася тое, што дваране ў сваёй большасці былі католікамі (таму іх называлі “палякамі”), а чыноўнікі — пераважна выхадцамі з велікарускіх губерняў. Таму ўплыў мясцовай інтэлігенцыі на развіццё нацыянальнай культуры, на фарміраванне нацыянальнай самасвядомасці беларускага народа быў абмежаваны і ў значнай ступені насіў супярэчлівы характар.

Табліца 1

*Размеркаванне ўсяго насельніцтва па пісьменнасці і адукацыі**

| | Непісьменныя | | Пісьменныя | | У тым ліку вучыўшыхся | | | | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | ва універсітэтах | | у спец. і тэхн. вышэйшых навуч. установах | | у спец. сярэдніх навуч. установах | | у сярэдніх навуч. установах | | у вышэйшых навуч. установах | у сярэдніх навуч. установах |
| | м | ж | м | ж | м | ж | м | ж | м | ж | м | ж | м | м |
| У 35 паветах (без гарадоў) | 2167890 | 2682118 | 728222 | 288731 | 1080 | 27 | 356 | 3 | 2422 | 211 | 8561 | 4716 | 51 | 971 |
| У гарадах 35 паветаў | 151455 | 197432 | 183679 | 115930 | 1845 | 124 | 369 | 17 | 1859 | 271 | 10865 | 8709 | 92 | 2409 |
| Усяго | 2319345 | 2879542 | 909901 | 384661 | 2925 | 151 | 716 | 20 | 4281 | 482 | 19426 | 13416 | 143 | 3380 |

Табліца 2

*Адноснае размеркаванне дваран патомных, асабовых і чыноўнікаў не з дваран і іх сем'яў па пісьменнасці і адукацыі**

| | Усяго | | З іх (у%) | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | непісьменных | | пісьменных | | вычыўшыхся ў сярэдніх, сярэдніх спец. і вышэйшых навуч. установах | |
| | м | ж | м | ж | м | ж | м | ж |
| У 35 паветах (без гарадоў) | 64895 | 67148 | 44,2 | 57,5 | 55,8 | 42,5 | 8,8 | 3,7 |
| У гарадах 35 паветаў | 20413 | 21778 | 18,8 | 29,2 | 81,2 | 70,8 | 49,1 | 24,2 |
| Разам | 85308 | 88918 | 38,2 | 48,1 | 61,8 | 58,9 | 18,4 | 8,7 |

* Табліцы складзены па матэрыялах крыніцы [1].

## *Літаратура*

1. Первая всеобщая перепись населения Российской империи, 1897 г. IV. Виленская губерния. Тетрадь 3. СПб., 1904. С. 28, 34, 40; V. Витебская губерния. Тетрадь 3. СПб., 1903. С. 28, 32, 40, 48, 56; XI. Гродненская губерния. Тетрадь 3. СПб., 1904. С. 58, 63, 80, 87; XXII. Минская губерния. Тетрадь 3. СПб., 1904. С. 52, 58, 64, 70; XXIII. Могилевская губерния. Тетрадь 3. СПб., 1903. С. 52, 60, 68, 76, 84.
2. Исторический обзор деятельности Комитета министров. Т. 3. Ч. 1. СПб., 1902. С. 221.



## *Summary*

*On the basis of original documents and sources the article covers the educational level of nobility in comparison with other estates and social groups of Belarus.*


УДК 947.083(476)

*І. Г. Яцкевіч*

# Першамайская агітацыя Бунда ў Беларусі ў 1908 — першай палове 1914 гг.

Святкаванне Першага мая — дня інтэрнацыянальнай салідарнасці працоўных — заўсёды знаходзілася ў цэнтры ўвагі расійскай сацыял-дэмакратыі, з'яўлялася адным са сродкаў далучэння рабочых да палітычнага жыцця. Роля гэтага свята ў жыцці рабочых рэгулярна асвятлялася і ў нелегальных выданнях Бунда — Усеагульнага яўрэйскага рабочага саюза ў Літве, Польшчы і Расіі. Нават пасля заканчэння рэвалюцыі 1905 -07 гг. у перыяд найбольшага заняпаду партыйнай дзейнасці ў 1908 г. быў выдадзены першамайскі лісток ЦК Бунда. Рабочыя заклікаліся да таго, каб "святкаваннем 1 Мая даказаць, што не знікла тая сіла, якая ў дні крывавай схваткі самаадданна змагалася за правы і свабоды ўсіх прыгнечаных" [1]. Але мясцовыя арганізацыі, якія ў той час практычна не функцыянавалі, не разгарнулі агітацыі ў адносінах святкавання 1 Мая.

У 1909 г. пры абмеркаванні зместу першамайскай адозвы і цыркуляра мясцовым арганізацыям паміж членамі ЦК Бунда ўзніклі рознагалоссі наконт формы святкавання. Некаторыя кіраўнікі прапанавалі ўчыняць, дзе магчыма, забастоўкі. Але было прынята рашэнне рэкамендаваць бундаўцам на месцах склікаць сходы і заклікаць на іх да актыўнасці і арганізаванасці [2].

Першамайская адозва ЦК Бунда, выдадзеная на яўрэйскай мове агульнай колькасцю ў 20 тыс. экз., была распаўсюджана мясцовымі арганізацыямі практычна без страт [3]. Але шырокай агітацыі вакол